Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12

DOI:10.17951/sb.2022.16.261-276
Studia Białorutenistyczne 16/2022 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Viktoria Liashuk / Вікторыя Ляшук

Matej Bel University in Banská Bystrica (Slovakia)
e-mail: Viktoria.Liashuk@umb.sk
https://orcid.org/0000-0002-8281-6411

# Тыпалагічныя прыкметы беларускай і польскай літаратурных моў: спецыфіка канцэптуалізацыі

*Typological Features of Belarusian and Polish Literary Languages: The Specifics of Conceptualization*

*Cechy typologiczne białoruskiego i polskiego języków literackich: specyfika konceptualizacji*

**Abstract**

The typological parameters to analyse the phenomenon of the national literary language on the basis of its terminological and theoretical presentation in the Belarusian and Polish scientific and educational paradigm are used in the article. Theoretical, educational methodological and lexicographic sources reflecting common and distinctive features in the conceptualization of the national literary language of Belarusians and Poles are used as analytical material. A terminological and classificatory asymmetry is traced in the interpretation of the national literary Slavic language within the boundaries of national linguistic and Slavic studies. The conceptualization of the Belarusian and Polish literary languages is indirectly related to their typological parameters and can be used as a typological model.

**Keywords**: the theory of literary language, linguistic Slavic studies, typological parameters, stylistic system of the national language, functional style system

**Abstrakt**

Artykuł wykorzystując parametry typologiczne analizuje fenomen narodowego języka literackiego na podstawie jego terminologicznej i teoretycznej prezentacji w białoruskim i polskim paradygmacie naukowo-edukacyjnym. Jako materiał analityczny wykorzystano źródła teoretyczne, dydaktyczne i leksykograficzne, odzwierciedlające wspólne, charakterystyczne cechy w konceptualizacji narodowego języka literackiego Białorusinów i Polaków. Występuje

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



asymetria terminologiczna i klasyfikacyjna w interpretacji słowiańskiego języka literackiego w ramach językoznawstwa narodowego i slawistyki. Konceptualizacja białoruskiego i polskiego języka literackiego jest pośrednio związana z ich parametrami typologicznymi i może być wykorzystana jako model typologiczny.

**Słowa kluczowe**: teoria języka literackiego, slawistyka językowa, parametry typologiczne, system stylistyczny języka narodowego, system stylów funkcjonalnych

**Анатацыя**

У артыкуле па тыпалагічных параметрах аналізуецца феномен нацыянальнай літаратурнай мовы на аснове яе тэрміналагічнага і тэарэтычнага прэзентавання ў беларускай і польскай навукова-адукацыйнай парадыгме. Аналітычным матэрыялам паслужылі тэарэтычныя, навучальна-метадычныя і лексікаграфічныя крыніцы, якія адлюстроўваюць агульныя і адрозныя асаблівасці ў канцэптуалізацыі нацыянальнай літаратурнай мовы беларусаў і палякаў. Прасочваюцца тэрміналагічная і класіфікацыйная асіметрыя ў інтэрпрэтацыі нацыянальнай славянскай літаратурнай мовы ў межах прыватнай лінгвістыкі і славістыкі. Канцэптуалізацыя беларускай і польскай літаратурных моў ускосным чынам звязана з іх тыпалагічнымі параметрамі і можа быць выкарыстана ў якасці тыпалагічнай мадэлі.

**Ключавыя словы**: тэорыя літаратурнай мовы, лінгвістычная славістыка, тыпалагічныя параметры, стылістычная сістэма нацыянальнай мовы, сістэма функцыянальных стыляў

## Уводныя заўвагі

Літаратурная мова належыць да базавых паняццяў тэорыі і тыпалогіі літаратурных моў, у тым ліку славянскіх, якія актыўна развіваюцца з другой паловы XX стагоддзя (працы Даліміра Брозавіча, Віктара Ўладзіміравіча Вінаградава, Віктара Барнета, Мікіты Ільіча Талстога, Станіслава Ўрбаньчыка, Ніны Барысаўны Мячкоўскай, Льва Міхайлавіча Шакуна, Генадзя Апанасавіча Цыхуна і інш.).

Тыпалагічныя прыкметы славянскіх літаратурных моў распрацоўваюцца ў сувязі з выяўленнем агульных і спецыфічных тэндэнцый у развіцці, функцыянаванні і кадыфікацыі асобных нацыянальных моў. Тыпалагічнае чляненне значна адрозніваецца ад традыцыйнай генетычнай класіфікацыі як сваімі параметрамі, так і прыкметамі тыпалагізацыі. Так, найбольш распрацаванымі з'яўляюцца наступныя прыкметы: (1) сувязь з традыцыяй (параметр: традыцыя ў моўным развіцці); (2) правапісная сістэма (параметр правапіснай спецыфікі); параметр, звязаны з моўнай сітуацыяй і нарматыўна-стылістычнай сістэмай, уключае некалькі тыпалагічных прыкмет – (3) наяўнасць / адсутнасць дыялектнай базы; (4) блізкасць / аддаленасць літаратурнай мовы ад дыялектнай базы; (5) канкурэнцыя наддыялектных пісьмовых утварэнняў пры нармалізацыі літара-

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



турнай мовы; (6) „узрост” і ступень традыцыйнасці сучаснай літаратурнай мовы; параметр моўных кантактаў і сувязей таксама ахоплівае некалькі тыпалагічных прыкмет – (7) уплыў надэтнічнай (царкоўнаславянскай або лацінскай) мовы; (8) уплыў сучаснай іншаславянскай мовы; (9) ігнараванне як самастойнай мовы і інш. У дачыненні да кожнай літаратурнай мовы тыпалагічныя прыкметы ўтвараюць розныя канфігурацыі, адлюстроўваючы яе агульныя і спецыфічныя характарыстыкі.

Усе комплексна распрацаваныя, дапоўненыя і ўдакладненыя намі 23 тыпалагічныя прыкметы сведчаць пра поўнае адрозненне беларускай і польскай літаратурных моў (гл. Liashuk, 2007; Ľašuková, 2009; Liashuk, 2012, 2017, 2019a, 2019b і інш.). Толькі ў адной прыкмеце іншаславянскага ўплыву гэтыя дзве літаратурныя мовы ўключаюцца ў адно тыпалагічнае апісанне, але маюць розны статус пры кантактаванні: польская ўплывае на беларускую (Ľašuková, 2009, s. 44, s. 52–53).

Літаратурная мова з’яўляецца вынікам свядомага ўздзеяння, яна культывуецца сваімі носьбітамі паводле канкрэтных праграм уздзеяння (падтрымкі), уключаецца ў моўную палітыку краіны. Веды пра літаратурную мову даследчыкі абагульняюць, пэўным чынам сістэматызуюць, афармляючы з дапамогай тэрмінаў у навуковыя, навукова-метадычныя, даведачныя і навукова-папулярныя тэксты, што складае сутнасць канцэптуалізацы.

У агульнанавуковым плане пад канцэптуалізацыяй разумеецца працэс вылучэння набору катэгарыяльных (тыпалагічных) прыкмет пэўнай з’явы або ўяўнай рэчаіснасці, якія дазваляюць скласці дынамічнае паняцце пра яе і адрозніць ад іншых феноменаў. У дачыненні да літаратурнай мовы гэты працэс суправаджаецца стварэннем канцэпцыі як сістэмы поглядаў на моўную сітуацыю і канфігурацыю канкрэтных тыпалагічных прыкмет, што, як правіла, дапаўняецца і праграмай уздзеяння (кадыфікацыі, культывавання). Лічым, што тыпалагічныя параметры выступаюць базай для канцэптуалізацыі, якую дазваляюць вывучаць і параўноўваць прысвечаныя літаратурнай мове навуковыя працы, а таксама навукова-метадычная і даведачная літаратура.

**Мэтай артыкула** з’яўляецца вывучэнне і параўнанне асаблівасцей канцэптуалізацыі беларускай і польскай літаратурных моў на аснове іх інтэрпрэтацыі і прэзентацыі ў навуковай, навукова-метадычнай і даведачнай (энцыклапедычнай) літаратуры на кожнай з указаных моў, а таксама міжмоўнай суаднесенасці навуковай інфармацыі з улікам выкарыстанай тэрміналогіі, яе інтэрпрэтацыі і вылучэння актуальных праблем. Мяркуем, што тыпалагічна адрозныя, у тым ліку паводле сувязі з традыцыяй, беларуская (новы тып) і польская (архаічны тып) літаратурныя мовы будуць мець адрозненні ў канцэптуалізацыі ў залежнасці ад іх тыпалагічных прыкмет.

**Метадамі даследавання з’яўляюцца:** параўнальна-тыпалагічны, інтэрпрэтацыйны, а таксама метад тэрміналагічнага і тэкставага канцэптуальнага суаднясення.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



1.1 Тыпалагічныя даследаванні літаратурных моў належаць да перспектыўных у тэарэтыка-практычным плане і маюць міждысцыплінарнае вымярэнне.

Найбольш поўна ў сучаснасці распрацаваны тыпалагічныя прыкметы, якія датычацца характарыстык, выяўленых і прасочаных у гісторыі літаратурных моў розных славянскіх народаў. Іх моўнае кантактаванне вызначае знешні ўплыў і таксама належыць да тыпалагічнага параметру. Беларуская мова кантактуе з польскай мовай на захадзе, з рускай мовай на ўсходзе, выконваючы для іх ролю пасрэдніцы і адначасова дыстанцыі паміж імі. Літаратурная разнавіднасць таксама адлюстроўвае гэту спецыфіку. Пры гэтым Г.А. Цыхун звяртае ўвагу на тыпалагічны дыстантны ўплыў: „Літаратурныя мовы могуць узаемадзейнічаць і з несуседнімі мовамі шляхам пераймання мадэляў (узораў) развіцця, структурных прынцыпаў і г. д., а таксама ў дыяхранічным плане – праз уздзеянне больш ранняй па часе ўтварэння літаратурнай мовы на фарміраванне больш позняй" (Cyhun, 2012, s. 108–109).

1.2 Кантактаванне беларускай і польскай моў у шэрагу выпадкаў разглядаецца ў трохкампанентнай мадэлі, з уключэннем рускай мовы – „развитие белорусского языка как среднего между польским и русским, но более близкого к последнему на территории этнической Беларуси определялось геополитическим положением страны" (Gruco, 2009, s. 104).

Размяшчэнне беларускай мовы паміж дзвюма тыпалагічна суадноснымі і функцыянальна актыўнымі славянскімі мовамі ўплывае на развіццё беларускай літаратурнай мовы, якая мае спецыфіку – абмежаваную (у іншых падыходах – запаволеную, перарваную, прыпыненую, забытую) пісьмовую традыцыю – і прайшла складаны этап свайго аднаўлення / вяртання. Тыпалагічная блізкасць выяўлена намі паміж дыстантнымі беларускай і славацкай літаратурнымі мовамі, асабліва ў перыяд іх пісьмовага адраджэння, прычым неабходна мець на ўвазе, што вуснае моўнае функцыянаванне, г. зн. вусная традыцыя, не перарывалася, што прывяло да актуалізацыі пры кадыфікацыі фальклорнага кайнэ (Ľašuková, 2009). Славацкая даследчыца Івана Сліўкова, параўноўваючы лінгвістычную дзейнасць заснавальніка беларускага мовазнаўства Яўхіма Карскага і аднаго з пачынальнікаў славацкай лінгвістыкі Самуэла Цамбела ў рускім рэзюмэ да славацкамоўнай манаграфіі ўказала на ўнутраныя і знешнія ўплывы:

> Положение литературного языка, как словацкого, так и белорусского, определялось не только сферой его употребления, но и элементами интерференции, проникающими в эти языки извне. Языковая принадлежность была политическим, социальным и мифологическим вопросом. В трудах лингвистов того времени С. Цамбела и Е. Ф. Карского мы находим взгляд на реальные условия развития литературных языков, способы их описания и отражение того полемического спектра мнений, которые привели к восприятию сущности отдельного литературного языка (Slivková, 2021, s. 284–285).

1.3 Сучасныя ўмовы існавання беларускай літаратурнай мовы з улікам гісторыі вяртання яе да сваёй пісьмовай традыцыі ў полімоўнай прасторы

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



комплексна ахарактарызаваў акадэмік Аляксандр Аляксандравіч Лукашанец: „Фарміраванне ў пачатку XX стагоддзя новай беларускай літаратурнай мовы і станаўленне яе сучасных норм у значнай ступені абумоўлена ўплывам суседніх блізкароднасных моў (польскай і рускай)" (Lukašanec, 2014, s. 33).

Знешнемоўны ўплыў на беларускую літаратурную мову мае ўстойлівы і вектарны характар. Пры гэтым дынаміка і працягласць уздзеяння кожнай з дзвюх названых моў маюць розную інтэнсіўнасць і якасць: „Асаблівасці моўнай сітуацыі ў Беларусі зрабілі актуальным пастаянны ўплыў рускай мовы і перыядычны – польскай на сістэму беларускай мовы" (Lukašanec, 2014, s. 50).

Нацыянальна-спецыфічныя якасці беларускай літаратурнай мовы, аднак, і пры такіх складаных умовах існуюць на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы, на што ўказваюць спецыялісты, якія з'яўляюцца актыўнымі карыстальнікамі і звязаны з беларускай моўнай традыцыяй натуральным шляхам ад самага свайго нараджэння:

> Нягледзячы на складанасці і супярэчнасці развіцця сваёй сістэмы, беларуская мова на працягу XX стагоддзя захавала сваю нацыянальную спецыфіку і сёння з'яўляецца высокаразвітай літаратурнай мовай са стабільнымі нормамі і багатым слоўнікавым складам, якая можа паспяхова абслугоўваць усе камунікатыўныя патрэбы сучаснага грамадства (Lukašanec, 2014, s. 50).

Адлюстраваная ў цытаце патэнцыяльнасць належыць да беларускай спецыфікі, паколькі польская літаратурная мова ў поўнай меры рэалізуе свой патэнцыял, на што ўвага навукоўцаў таму і не засяроджваецца.

Не ў поўнай меры выкарыстаныя магчымасці беларускай літаратурнай мовы адлюстроўвае тэрмін *неўжыванне*, які ўключаецца ў праект Стратэгіі развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі, ініцыяваны Таварыствам беларускай мовы імя Францішка Скарыны (аўтары Сяргей Запрудскі, Алена Анісім, Уладзь Кошчанка, Сяргей Кручкоў, Адам Мальдзіс, Алена Таболіч, Генадзь Цыхун), дзе адзначаецца, што „існуе вялікае разыходжанне паміж колькасцю людзей, якія валодаюць беларускай мовай, і колькасцю людзей, якія рэальна карыстаюцца ёй у самых розных жыццёвых сітуацыях (першых намнога больш, чым другіх). Традыцыя *неўжывання* беларускай мовы мае асабліва глыбокія і трывалыя карані ў гарадскім асяроддзі" (Zaprudskì i inš., 2000, s. 1; курсіў наш – *В.Л.*).

На основе абагульнення розных навуковых падыходаў беларускі даследчык, аўтарытэтны гісторык беларускай мовы Л. М. Шакун, разглядае тыпалогію літаратурных моў на ўсходнеславянскім матэрыяле як „сацыяльна-функцыянальную іх характарыстыку з пункту гледжання падабенства і адрозненняў гістарычнага развіцця і выкарыстання ў пэўных моўных сітуацыях" (Šakun, 2001, s. 111).

Важнейшымі тыпалагічнымі параметрамі, паводле меркавання названага навукоўца, могуць служыць

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



> дыферэнцыяльныя прыметы (універсальныя адрозненні), якімі акрэсліваецца паняцце літаратурнай мовы наогул <...>: 1) яе апрацаванасць (стандартнасць); 2) селекцыйнасць і рэгламентацыя ў выкарыстанні ўласцівых ёй сродкаў выказвання; 3) яе наддыялектнасць; 4) поліфункцыянальнасць (полівалентнасць) і 5) функцыянальна-стылістычная варыятыўнасць. Іншыя адзнакі, істотныя для тыпалогіі літаратурных моў, так ці інакш „укладваюцца" ў гэтыя параметры (хоць увогуле гэтых адзнак спатрэбіцца даволі вялікая колькасць) (Šakun, 2001, s. 111).

Указанае колькаснае павелічэнне тыпалагічных параметраў адбываецца за кошт новага фактычнага матэрыялу. Даследуючы спецыфіку рэдагавання тэкстаў у гады актыўнай беларусізацыі (20-я гг. XX ст.), што належыць да формы культывавання літаратурнай мовы, беларускі даследчык С. Запрудскі пералічвае колькасна большы „шэраг фактараў", па сваёй сутнасці, – тыпалагічных параметраў, пашыраных за кошт адзнак моўнай сітуацыі, профіля карыстальнікаў, метамоўнага асэнсавання (г. зн. канцэптуалізацыі):

> 1) грамадскі статус беларускай мовы і яе літаратурнай формы ў прыватнасці; 2) узровень нацыянальнай самасвядомасці, ступень распрацоўкі нацыянальнай ідэалогіі і стан беларускай дзяржаўнасці; 3) наяўнасць больш ці менш шырокага кола ўжывальнікаў і спажыўцоў літаратурнай формы беларускай мовы; 4) узровень развіцця беларускай літаратуры і літаратурнай крытыкі; 5) корпус створаных на беларускай мове тэкстаў; 6) ступень завершанасці фарміравання беларускай літаратурнай мовы; 7) стан сфарміраванасці катэгорый «нарматыўнасць» і «правільнасць» мовы ў свядомасці лінгвістаў і, больш шырока, носьбітаў літаратурнай мовы ў Беларусі і за яе межамі; 8) спецыфіку корпуса наяўных беларускіх нарматыўных граматык і слоўнікаў; 9) ступень развітасці ў грамадстве лінгвістычнай свядомасці і інтэнсіўнасць культывавання дыскурсу аб мове ў цэлым (Zaprudskì, 2015, s. 31).

Моўная сітуацыя на Беларусі звязана таксама з альтэрнатыўным варыянтам вусна-пісьмовай разнавіднасці, які атрымаў назву *тарашкевіца* паводле аўтара школьнай граматыкі Браніслава Тарашкевіча. Гэтая сістэма ўтварае апазіцыю да „агульналітаратурнай беларускай мовы" (Lukašanec, 2009, s. 13). Гэтую альтэрнатыву А. Лукашанец характарызуе з навуковага пункту погляду наступным чынам: „Другі варыянт літаратурна-пісьмовай беларускай мовы, арыентаваны на пісьмовую традыцыю 20-х гг. XX ст. і пісьмовую практыку беларускага замежжа" (Lukašanec, 2009, s. 13). Акадэмік станоўча ацэньвае тарашкевіцу як культурную з'яву, якая „фактычна сімвалізуе істотны этап гістарычнага развіцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы і з'яўляецца адным з важных элементаў духоўнай культурнай спадчыны беларускага народа" (Lukašanec, 2009, s. 13).

Карыстальнікі тарашкевіцы інтэрпрэтуюць яе як сінхронную і раўназначную альтэрнатыву беларускай літаратурнай мове, якую палітызуюць у назве

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



*наркамаўка* (паводле ўладнай установы, што ўплывала на дзяржаўную моўную палітыку ў акрэслены вышэй гістарычны перыяд). Пры такім падыходзе лінгвіст Ігар Клімаў гаворыць пра „двухстандартнасць беларускай літаратурнай мовы" (Klìmaŭ, 1999) і „нарматыўны плюралізм у беларускай літаратурнай мове" (Klìmaŭ, 2012). Такая тэрміналогія сведчыць пра пашырэнне канцэптуалізацыі беларускай літаратурнай мовы і патрабуе глыбейшага навуковага даследавання. Функцыянальная абмежаванасць беларускай літаратурнай мовы прывяла да яе канцэптуальнага пераасэнсавання з боку карыстальнікаў з перарванай / запозненай філагенетычнай беларускамоўнай традыцыяй. У параўнанні з польскай літаратурнай мовай названую асаблівасць таксама неабходна азначыць за беларускую спецыфіку.

Неабходна адзначыць, што навуковы кантэкст тыпалагічнай інтэрпрэтацыі беларускай літаратурнай мовы пашыраюць польскія беларусісты. Увядзенне новага фактычнага беларускага матэрыялу ўдакладняе або змяняе тыпалогію, што тычыць параметра пісьмовай традыцыі. У гэтым плане істотнымі з'яўляюцца даследаванні рэлігійных друкаваных тэкстаў польскім філолагам Йоанай Геткай, якія адлюстроўваюць значны тыпалагічны зрух і магчымую канцэптуальную змену ў інтэрпрэтацыі беларускамоўнай пісьмовай традыцыі, сфармуляваныя ў назве аднаго з артыкулаў: *Перарванне ці ўтрыманне (стара)беларускай пісьмовай традыцыі ў XVIII стагоддзі? Унёсак у дыскусію пра развіццё беларускай літаратурнай мовы на матэрыяле выданняў базыльянскіх друкарняў Супрасля і Вільні* (Getka, 2020). У агульным ключы з беларускімі даследчыкамі разглядаюцца польскімі беларусістамі і праблемы рэлігійнага стылю ў функцыянальнай стылістыцы як уласцівасць нацыянальнай літаратурнай мовы (Kazloŭskaâ-Doda, 2013).

2.1. Агульнае мовазнаўства ў літаратурнай мове вычляняе асобныя канцэптуальныя вузлы, істотныя для сістэмных лінгвістычных ведаў. Універсальныя прыкметы літаратурных моў атрымалі інтэрпрэтацыю як тэарэтычная аснова ведаў пра гэтую разнавіднасць. Канцэптуалізацыя беларускай літаратурнай мовы ў беларускамоўным падручніку *Агульнае мовазнаўства* рэалізуецца на шырокім лінгвістычным фоне ў параўнальна-супастаўляльным плане ў асобнай тэме *Літаратурныя мовы і моўная нормы* (Plotnìkaŭ, 1994, s. 62–64), у якой на першы план вынесена інфармацыя пра свядомае ўздзеянне, пазней указваецца тыповая функцыя:

> Літаратурная мова ў пэўнай меры мае штучны характар, бо ў яе аснове ляжыць паняцце нормы, якое свядома фарміруецца, вызначаецца і перавызначаецца прадстаўнікамі грамадства. <...>. Літаратурная мова звычайна служыць вышэйшай формай і самым аўтарытэтным прадстаўніком нацыянальнай мовы, але незаўсёды супадае з ёй (Plotnìkaŭ, 1994, s. 62).

Прагрэсіўную ролю літаратурнай мовы цытаваны аўтар акрэслівае ў дачыненні да дыялектнай разнастайнасці. Пры гэтым прыводзіць і пары

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



генетычна блізкіх славянскіх моў з тыпалагічна адрознымі літаратурнымі мовамі, пачынаючы з рускай і беларускай:

> Такім чынам, літаратурная мова служыць своеасаблівай мовай-пасрэднікам, бо яна дае магчымасць зносіцца паміж сабой людзям, якія з'яўляюцца носьбітамі розных дыялектаў адной мовы. Адзначым у сувязі з гэтым, што паміж дыялектамі некаторых моў, напрыклад, нямецкай, кітайскай, занатоўваецца больш адрозненняў, чым паміж роднаснымі мовамі тыпу рускай і беларускай, чэшскай і славацкай, балгарскай і македонскай і інш. (Plotnìkaŭ, 1994, s. 64).

У польскім падручніку для вышэйшай школы па мовазнаўстве прыведзены падыход да літаратурных моў Еўропы (з упамінаннем рэпрэзентатыўных з іх) як развіццё абагульняльных абазначэнняў і пашырэнне іх у тэкстах у адваротных суадносінах з канкрэтнымі абазначэннямі –

> procent wyrazów konkretnych maleje przy powiększaniu się procentu wyrazów ogólnych, które zajmują coraz większą część tekstów ułożonych w tych językach. Najdalej posunięty rozwój w tym kierunku nastąpil w systemach słownikowych *języków literackich* Europy tak starożytnej (greka, łacina), jak i współczesnej (włoski, francuski, angelski, niemecki, polski, rosyjski itd.). Reprezentują one typ ekspansywny, rozpowszechniający się (Milewski, 2009, s. 171; курсіў наш – *В.Л.*).

Польскі адукацыйны ракурс у цытаваным вышэй тэрміне *język literacki* вылучае аспект правільнасці і аксіялагічнасці ў валоданні літаратурнай мовай як „poprawne, zgodne z normą formułowanie wypowiedzi" (Bugajski, 2007, s. 229–230). Гэтая спецыфіка выступае дыферэнцыйнай прыкметай польскай літаратурнай мовы, расчлененай на два паняцці, адлюстраваныя ў тэрмінах *język literacki* і *język ogólny.* Такое падваенне і пераход статуса польскай літаратурнай мовы на тэрмін *język ogólny* ініцыяваў вядомы гісторык мовы Зянон Клемянсевіч у сваёй працы *Пра розныя разнавіднасці сучаснай польскай мовы* (*O różnych odmianach współczesnej polszczyzny*, 1953), зыходзячы з сацыялінгвістычных змен у партрэце носьбітаў. З гэтай працы пачынаецца актыўнае рэагаванне на прапанаваны тэрмін і ствараюцца розныя ўнутраныя тыпалогіі, якія комплексна інтэрпрэтуюцца ў працах, прысвечаных названай праблематыцы (Wilkoń, 2000, s. 12–21), а таксама стылістыцы (Zdunkiewicz-Jedynak, 2010, s. 30–36) і інш.

Дынаміку тэрміна і яго сувязь з іншымі тэрмінамі ў дыяхранічным і сінхранічным плане ўключыла ў адукацыйны кантэкст Дарота Здункевіч-Едынак:

> Podstawową odmianą języka, mającą zasięg ogólnonarodowy, a więc tą, którą – jak się przyjmuje za Z. Klemensiewiczem <...> – posługują się użytkownicy polszczyzny bez

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



> względu na wiek, płeć, pochodzenie społeczne i terytorialne, a także wykonywany zawód, jest **język ogólnopolski** (nazywany dziś także **językiem ogólnym** lub **standardowym**). Jest on upowszechniany przez szkołę, a jego opanowanie jest konieczne do czynnego uczestnictwa w kulturze. Dawniej stosowano wobec tej odmiany także terminy: **język literacki** oraz **dialekt kulturalny**. Nie są one do końca równoważne. Pierwszy – raczej odnosił się do wersji pisanej języka ogólnego, drugi – do wariantu swobodnego, mówionego. Zwycięstwo w terminologii językoznawczej terminu *język ogólny* jest związane ze zmianami w samym języku (Zdunkiewicz-Jedynak, 2010, s. 22; вылучана цытаваным аўтарам – *В. Л.*).

З улікам падыходаў вядомага польскага стыліста Станіслава Гайды звяртаецца ўвага на сацыяльна-гістарычныя ўмовы пасляваеннага часу (50-я гг. XX ст.): „W tych okolicznościach wyłonił się nowy język literacki, który nieco inaczej jest usytuowany względem pozostałych odmian języka narodowego. Język literacki podlega procesom **demokratyzacji** i równolegle **deelitaryzacji**" (Zdunkiewicz-Jedynak, 2010, s. 22–23; вылучана цытаваным аўтарам – *В. Л.*).

Сам Зянон Клемянсевіч паслядоўна прытрымліваўся сваёй дыферэнцыяцыі ва ўсіх наступных працах, у тым ліку, у *Гісторыі польскай мовы* (*Historia języka polskiego*, 1961–1972). Больш вузкі тэрмін лінгвіст звязвае з адукацыяй носьбіта мовы і культурай валодання ёю:

> Języka literackiego używa się dla ukształtowania na piśmie wypowiedzi w procesie stylizacji pojętej jako świadoma i celowa, wyborcza i wartościująca operacja językowa, dokonywana przez wytwórcę w poczukiwaniu takiej struktury, która by okazywała największą zdatność i stosowność w realizowaniu jego zamierzeń komunikatywnych, ekspresywnych, impresywnych. <...>. Krótko określimy język literacki jako tę odmianę języka ogólnego, która podlega nie tylko normom poprawności gramatyczno-leksykalnej – i to ściślej ujętym i przestrzeganym niż w odmianie mówionej – ale też stylistycznym dyrektywom doboru środków językowych dla określonego typu wypowiedzi pisanej, np. artystycznej, naukowej, dydaktycznej itp. (Klemensiewicz, 1981, s. 78).

Абодва тэрміны прадстаўлены як эквівалентныя ў „Слоўніку славянскай лінгвістычнай тэрміналогіі" (1977) – супастаўляльнай лексікаграфічнай працы, створанай у супрацоўніцтве лінгвістаў розных славянскіх краін і заходніх славістаў з мэтай „перадаць асноўнае (цэнтральнае) значэнне, зададзенае пазіцыяй, якую займае паняцце ў сістэме лінгвістычных паняццяў-тэрмінаў, пасрэдніцтвам адпаведных адэкватных эквівалентаў на суаднесеных славянскіх мовах" (SSLT–1, s. XIX). Польскія аўтары Вітольд Дарашэўскі (W. Doroszewski), Данута Бутлер (D. Buttler) і Галіна Саткевіч (H. Satkiewicz) (SSLT–1, s. 22) выбралі 2 эквіваленты аднаму тэрміну ў іншых славянскіх мовах; ніжэй прыводзім прыклады з заходнеславянскіх і ўсходнеславянскіх крыніц. Польскія тэрміны ў паслядоўнасці пералічэння перадаюць прыярытэт першага з іх (дамінантнага). Беларускі тэрмін прапанаваў калектыў беларускіх лінгвістаў (Анатоль

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



Іванавіч Кісялеўскі, Іван Іванавіч Лучыц-Федарэц, Арнольд Яфімавіч Міхневіч, Аляксандр Іосіфавіч Падлужны, Генадзь Апанасавіч Цыхун) пад кіраўніцтвам Міхаіла Раманавіча Судніка (SSLT–1, s. XXIII):

| | |
|---|---|
| Чэшск. | spisovný jazyk |
| Слв. | spisovný jazyk |
| Польск. | język ogólny (literacki) |
| Рус. | литературный язык |
| Укр. | літературна мова |
| Блр. | літаратурная мова |
| Індэкс | 1-5-17 |

Указаная індэксам пазіцыя ў тэрмінасістэме размешчана ў раздзеле агульных паняццяў. Аднак у супрацьлеглым па значэнню тэрміне *нелітаратурная мова* (індэкс 1-5-23), утвораным ў іншых мовах праз адмоўную прыстаўку, а ў рускай мове з дапамогай прыстаўкі *вне-* (*внелитературный язык*), польская частка слоўніка змяшчае таксама 2 тэрміны, але толькі з матывавальнай асновай *literacki*: *nieliteracka odmiana języka* і *język nieliteracki.* У пазнейшых польскіх працах з'яўляецца апазіцыя *język ogólny – języki nieogólne*: „Na plan pierwszy wysuwa się opozycja między *językiem ogólnym* a *językami nieogólnymi*, tj. gwarami ludowymi" (Wilkoń, 2000, s. 25). Суадносіны паміж гэтымі тэрмінамі ў розных польскіх аўтараў адрозніваюцца. Напрыклад, у падыходзе Станіслава Гайды „ogólny charakter ma jedynie język potoczny literacki. Nieogólne są „podjęzyki" literackie: administracyjny, naukowy, publicystyczny, artystyczny, a także supradialekty miejskie i wiejskie, żargony oraz gwary" (Wilkoń, 2000, s. 20).

2.2. Прэзентатыўнымі ў нацыянальна-культурным плане выступаюць у першую чаргу нацыянальныя мовы, і ў іх межах перш за ўсё літаратурныя. І ў Беларусі, і ў Польшчы нацыянальнай мове прысвечана спецыялізаваная экцыклапедыя – *Беларуская мова* (1994) і *Encyklopedia wiedzy o języku polskim* (1978). У іх канцэптуалізацыя літаратурнай мовы праводзіцца розным чынам: у польскай энцыклапедыі вылучаны і растлумачаны ў асобных артыкулах 3 апісальныя тэрміны: *Język literacki*; *Język ogólny* і *Język polski*. Указваецца ўзаемасувязь гэтых паняццяў праз іх гіпа-гіперанімічнае суаднясенне:

> **Język literacki**, czyli pisana odmiana języka ogólnego, przeciwstawia się odmianie mówionej, zwanej też językiem potocznym. <...>. Tak rozumiany język literacki utożsamia się czasem z językiem literatury pięknej, czyli stylem artystycznym, lub z językiem ogólnym (Pisarek, 1978a, s. 137).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



Функцыянальна-стылістычная сістэма і ўніверсальная адраснасць аднесены да спецыфікі агульнанароднай (агульнай) мовы, як гэта сфармуляваў З. Клемянсевіч:

> **Język ogólny** (inaczej: ogólnonarodowy), czyli ogólna odmiana kulturalna języka narodowego, jest w przeciwstawieństwie do wszystkich odmian regionalnych i środowiskowych tą odmianą, która upowszechniana przez szkolę, administrację, literaturę i prasę służyć ma jako środek porozumiewania się we wszystkich dziedzinach wszystkich członków narodu, bez względu na płeć, wiek, zawód pochodzenie społeczne i terytorialne. „<...>. Jej posiadanie jest jednym z wyników wykształcenia ogólnego, jednym ze znamion osiągniętego poziomu kulturalnego w skali ogólnonarodowej" (Z. Klemensiewicz). Niektórzy językoznawcy (np. A. Furdal) nazywają język ogólny językiem literackim (Pisarek, 1978b, s. 138).

У артыкуле, прысвечаным польскай мове, Станіслаў Урбаньчык выкарыстоўвае тэрмін *język literacki* ў аналагічным разуменні з характарыстыкай агульнай мовы Валерыем Пісаракам:

> **Język literacki** w obu swoich postaciach (pisanej a mówionej) jest najbardziej wypracowaną odmianą do obsługi wszystkich funkcji, jakie język może spełniać. <...>. Język literacki ma też bogate środki umożliwiające tworzenie utworów artystycznych, zróżnicowanych przy tym stylowo <...>. Język literacki jest produktem długiego i świadomego rozwoju, rezultatem wielowiekowej świadomej pracy nad uzdatnieniem go do wykonywania wszystkich zadań, stawianych przed językiem narodu o wysokiej kulturze (Urbańczyk, 1978, s. 139).

Энцыклапедыя *Беларуская мова* (1994) уключае вялікі артыкул *Літаратурная мова*, у якім аб'яднаны нацыянальна-спецыфічны і ўніверсальны планы:

> Для літаратурнай мовы эпохі нацыі характэрны наступныя агульныя асаблівасці: апрацаванасць, упарадкаванасць, нарматыўнасць, узаконеная грамадствам; стабільнасць, бесперапыннасць традыцыі, дзякуючы чаму змены, што пастаянна адбываюцца ў мове, не падрываюць асноў літаратурнай мовы; абавязковасць для ўсіх членаў калектыву, які валодае літаратурнай мовай; вядучая роля ў сістэме разнавіднасцей нацыянальнай мовы, развітая стылістычная дыферэнцыяцыя, універсальнасць (абслугоўванне ўсіх сфер зносін) (Bandarènka, 1994, c. 313).

Указваецца стандартная мадэль, у якую імплікаваны канкрэтныя аспекты моўнай сітуацыі, г. зн. прэзентуецца ўзорны функцыянальны тып літаратурнай мовы. Паняцце агульнанароднай мовы пры гэтым суадносіцца з польскім тэрмінам *język ogólny*:

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



> Літаратурная мова – апрацаваная, упарадкаваная і нармалізаваная форма агульнанароднай мовы, прызначэнне якой – абслугоўваць разнастайныя сферы грамадскай дзейнасці чалавека. Гэта мова школы, навукі, друку, радыё, тэлебачання, мастацкай літаратуры, дзяржаўных установ (Bandarènka, 1994, с. 312–313).

Факт абмежаванага выкарыстання беларускай літаратурнай мовы ў гарадах аўтар перадае ўскосным чынам, калі выбірае для характарыстыкі ідэальную мадэль, як вядома, у рэальнасці часткова змененую: „У ідэале літаратурная мова заўсёды разлічана на агульнанароднае ўжыванне” (Bandarènka, 1994, s. 313). Тыпалагічную характарыстыку беларускай літаратурнай мовы ўключае ў энцыклапедычны артыкул *Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў* Г. Цыхун, указваючы на “моцны ўплыў таксама з боку суседніх літаратурных моў, у першую чаргу – рускай, польскай, а на заключным этапе фарміравання – і ўкраінскай”  (Cyhun, 1994, s. 86).

Рэальная сітуацыя паўплывала на інтэрпрэтацыю літаратурнай мовы з няпоўным наборам прыкмет, прапанаваную гісторыкам беларускай мовы Л. М. Шакуном: „Адсутнасць некаторых інварыянтных характарыстык у той ці іншай моўнай фармацыі не супярэчыць аднясенню яе да катэгорыі літаратурных моў. Яна толькі прадвызначае своеасаблівасць тыпу адпаведнай літаратурнай мовы” (Šakun, 2001, s. 115).

2.3. Да характарыстыкі беларускай літаратурнай мовы звяртаецца ў інавацыйнай працы „Вопыт літаратурна-дыялектнага слоўніка беларускай мовы” (1999) У. В. Анічэнка, які фармулюе прыярытэт сваёй нарматыўнай асновы ў кадыфікацыі, гаворачы пра розныя падыходы: першы –

> больш узаемадзейнічаць з рускай мовай, другі – з польскаю. Трэці пункт гледжання засноўваецца на народна-нацыянальнай моўнай аснове свайго ўнутрыструктурнага і функцыянальнага развіцця. Апошні пункт погляду мае важкія падставы і яго прытрымліваецца большасць моваведаў і філолагаў шырокага профілю (Aničènka, 1999, s. 3).

Тыпалагічная прыкмета паводле сувязі беларускай літаратурнай мовы з народнымі гаворкамі атрымлівае лексікаграфічную базу, якая ўзмацняе патэнцыі для развіцця беларускай літаратурнай мовы, канцэптуалізацыя якой адлюстроўвае шматвектарную моўную сітуацыю, дыферэнцыяцыю карыстальнікаў паводле ўяўлення пра яе нацыянальны вобраз і функцыянальнасць. У польскіх працах сувязь літаратурнай мовы і дыялектаў прадстаўлена ў апазіцыі *język ogólny* а *języki nieogólne*, *tj. gwary ludowe* у больш шырокім разуменні – „Nie są to tylko gwary wiejskie, ale także miejskie, jak w przypadku gwary śląskiej czy kaszubskiej” (Wilkoń, 2000, s. 25).

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



## Заключэнне і вывады

Тыпалагічныя прыкметы беларускай і польскай літаратурных моў (сувязь з традыцыяй; блізкасць / аддаленасць літаратурнай мовы ад дыялектнай базы і інш.) ускосным чынам уплываюць на лінгвістычную тэрміналогію, лексікаграфічную прэзентацыю і адукацыйную прастору. Абедзве гэтыя мовы адлюстраваны пры канцэптуалізацыі беларускай літаратурный мовы паводле тыпалагічнай прыкметы ўплыў сучаснай іншаславянскай мовы. Розныя тыпалагічныя характарыстыкі прасочваюцца ў інтэрпрэтацыі беларускімі і польскімі філолагамі пісьмовай традыцыі, аб'ёма паняцця літаратурнай мовы, актыўнасці карыстання ёю і яе суаднесенасці з іншымі моўнымі ўтварэннямі. Спецыфіка канцэптуалізацыі адлюстроўвае розную інтэнсіўнасць іншаславянскага ўплыву і яго скіраванасць (уплыў польскай мовы на канцэптуалізацыю беларускай, у першую чаргу тарашкевіцы).

У канцэптуалізацыі польскай мовы значную ролю адыгрывае ўнутрымоўная тыпалогія разнавіднасцей, пра што сведчаць іх разнастайныя класіфікацыі і каментаванае ўключэнне ў адукацыйную прастору праз розныя лінгвістычныя дысцыпліны, але перш за ўсё – стылістыку. Канцэптуалізацыя беларускай літаратурнай мовы звязана з яе функцыянальна-стылістычнай дыферэнцыяцыяй (полівалентнасцю). У канцэптуалізацыі беларускай мовы значнае месца займаюць падыходы да суседніх польскай і рускай моў, а таксама шматмоўнасць і альтэрнатыўнасць моўнай сітуацыі. Беларуская і польская лінгвістыка ўзаемна, у тым ліку ў параўнальна-тыпалагічным плане, актыўна распрацоўваюць свой і іншаславянскі матэрыял суседзяў, што садзейнічае канцэптуальнаму суаднясенню і тыпалагізацыі. Польскія беларусісты спрыяюць навуковаму ўзаемаабмену і актуалізацыі асобных канцэптуальных палажэнняў. Супастаўленне канцэптуалізацыі літаратурнай мовы выявіла аспекты, даследаванне якіх дазволіць удакладніць і распрацаваць у параўнальным плане тыпалагічныя характарыстыкі, якія тычацца такіх нацыянальных моўных разнавіднасцей, як мова мастацкай літаратуры, фальклору, інтэрнэту, канфесійнай сферы і інш. утварэнняў.

## REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Anìčènka, Uladzìmìr. (1999). *Vopyt lìtaraturna-dyâlektnaga sloŭnìka belaruskaj movy*. Gomel′: GDU ìmâ F. Skaryny. [Анічэнка, Уладзімір. (1999). *Вопыт літаратурна-дыялектнага слоўніка беларускай мовы*. Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны].

Bandarènka,Tamara (1994). Lìtaraturnaâ mova. U: Arnol′d Mìhnevìč (rèd.). *Belaruskaâ mova: Èncyklapedyâ* (s. 312–314). Mìnsk: Belruskaâ èncyklapedyâ. [Бандарэнка, Тамара (1994). Літаратурная мова. У: Арнольд Міхневіч (рэд.). *Беларуская мова: Энцыклапедыя* (с. 312–314). Мінск: Белруская энцыклапедыя].

Bugajski, Marian. (2007). *Język w komunikowaniu*. Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



Cyhun, Genadz′ (1994). Belaruskaâ mova sârod ìnšyh slavânskìh moŭ. U: Arnol′d Mìhnevìč (rèd.). *Belaruskaâ mova: Èncyklapedyâ* (s. 84–86). Mìnsk: Belruskaâ èncyklapedyâ. [Цыхун, Генадзь (1994). Беларуская мова сярод іншых славянскіх моў. У: Арнольд Міхневіч (рэд.). *Беларуская мова: Энцыклапедыя* (с. 84–86). Мінск: Белруская энцыклапедыя].

Cyhun, Genadz′. (2012). *Vybranyâ pracy*. Mìnsk: RÌVŠ. [Цыхун, Генадзь. (2012). *Выбраныя працы*. Мінск: РІВШ].

Getka, Joanna Aleksandra. (2020). A Discontinuation or a Preservation of the (Old) Belarusian Writing Tradition in the 18th Century? Contributions to the Discussion on the Development of the Literary Belarusian Language as Applied to Publications of the Basilian Printing Oices in Supraśl and Vilnius. *Studia Białorutenistyczne*, 14, s. 279–295.

Gruco, Aleksej. (2009). Nekotorye zamečaniâ ob osobennostâh vzaimodejstviâ âzykov i istorii ètničeskoj Belarusi. U: Mìkalaj Antropaŭ (red.). *Belaruskaâ mova ŭ kul'turnaj prastory Slavìì. Mat. mìžnar. navuk. kanf. (Mìnsk, 24–25 lìstapada 2009 g.)* (s. 98–106). Mìnsk: Prava ì èkanomìka. [Груцо, Алексей. (2009). Некоторые замечания об особенностях взаимодействия языков и истории этнической Беларуси. У: Мікалай Антропаў (ред.). *Беларуская мова ў культурнай прасторы Славіі. Мат. Міжнар. навук. канф. (Мінск, 24–25 лістапада 2009 г.)* (с. 98–106). Мінск: Права і эканоміка].

Kazloŭskaâ-Doda, Âdvìga. (2013). *Bìblìjnaâ frazealogìâ belaruskaj ì pol'skaj moŭ: agul'nae ì roznae*. [Казлоўская-Дода, Ядвіга. (2013). Біблійная фразеалогія беларускай і польскай моў: агульнае і living рознае]. *Studia Białorutenistyczne*, 7, s. 245–258.

Klemensiewich, Zenon (1981). *Historia języka polskiego*. Warszawa: PWN.

Klìmaŭ, Ìgar. (2012).Da asènsavannâ narmatyŭnaga plûralìzmu ŭ belaruskaj lìtaraturnaj move. U: Mìhaìl Prygodzìč (rèd). *Belaruskaâ arfagrafìâ: zdabytkì ì perspektyvy: matèryâly rèspublikanskaj navuk.-prakt. kanf., prysvečanaj 90-goddzû BDU, Mìnsk 20–21 kastryčnìka 2011 g.* (s. 18–27). Mìnsk: BDU. [Клімаў, Ігар. (2012). Да асэнсавання нарматыўнага плюралізму ў беларускай літаратурнай мове. У: Міхаіл Прыгодзіч (рэд). *Беларуская арфаграфія: здабыткі і перспектывы: матэрыялы рэспубліканскай навук.-практ. канф., прысвечанай 90-годдзю БДУ, Мінск 20–21 кастрычніка 2011 г.* (с. 18–27). Мінск: БДУ].

Klìmaŭ, Ìgar. (1999). Dvuhstandartnasc′ belaruskaj lìtaraturnaj movy. U: Lìdzìâ Sâmeška (rèd.). *Mova – Lìtaratura – Kul'tura: matèryâly mìžnar. navuk. kanf., Mìnsk, 22–23 verasnâ 1998 g.* u 2 č., č. 1 (s. 134–137). Mìnsk: BDU. [Клімаў, Ігар. (1999). Двухстандартнасць беларускай літаратурнай мовы. У: Лідзія Сямешка (рэд.). *Мова – Літаратура – Культура: матэрыялы міжнар. навук. канф., Мінск, 22–23 верасня 1998 г.* у 2 ч., ч. 1 (с. 134–137). Мінск: БДУ].

Liashuk, Viktoryja. (2007). Mova slavânskaga fal′kloru ŭ typalagìčnyh dasledavannâh. [Ляшук, Вікторыя: Мова славянскага фальклору ў тыпалагічных даследаваннях]. W: Júlia Dudášová (ed.). *Slovensko-slovanské jazykové, literárne a kultúrne vzťahy: Zborník príspevkov z medzinárodnej vedeckej konferencie 4.–7. októbra 2006* (s. 35–49). Prešov: FF PU.

Liashuk, Viktória. (2012). Belorusskij i slovackij âzyki v tipologii slavânskih literaturnyh âzykov. [Ляшук, Виктория. Белорусский и словацкий языки в типологии славянских литературных языков]. *X Linguae European Scientific Language Journal*, 2012, 5(4), s. 29–44.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



Liashuk, Viktória. (2017). *Teoriâ slavânskih literaturnyh âzykov v diahronii i sinhronii.* [Ляшук, Виктория. *Теория славянских литературных языков в диахронии и синхронии.*]. Banská Bystrica: Belianum.

Liashuk, Viktória (2019a). *Fol'klornoe kojne v konceptualizacii slavânskih literaturnyh âzykov.* Minsk: Belaruskaâ navuka. [Ляшук, Виктория. *Фольклорное койне в концептуализации славянских литературных языков.* Минск: Беларуская навука].

*Liashuk, Viktória. (2019b).* Slavânskie literaturnye âzyki v sovremennoj naučnoj paradigme. *[Славянские литературные языки в современной научной парадигме]. W: Viktória Liashuk (red.). Spisovné jazyky západných a východných Slovanov v synchrónii a diachrónii: otázky teórie: zborník vedeckých príspevkov (c. 16–28). Banská Bystrica: Belianum.*

Lukašanec, Alâksandr. (2009). Belaruskaâ mova: asablìvascì sučasnaga stanu ì funkcyânavannâ. *Rodnae slova*, 2, s. 11–14. [Лукашанец, Аляксандр. (2009). Беларуская мова: асаблівасці сучаснага стану і функцыянавання. *Роднае слова,* 2, с. 11–14].

Lukašanec, Alâksandr. (2014). *Belaruskaâ mova ŭ XXI stagoddzì: razvìccë sìstèmy ì prablemy funkcyânavannâ*. Mìnsk: Belaruskaâ navuka. [Лукашанец, Аляксандр. (2014). *Беларуская мова ў XXI стагоддзі: развіццё сістэмы і праблемы функцыянавання*. Мінск: Беларуская навука].

Ľašuková [Ляшук], Viktoria. (2009). *Folklórny vektor v kodifikácii bieloruského a slovenského jazyka.* Prešov: FF PU.

Milewski, Tadeusz. (2009). *Językoznawstwo*. Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN.

Pisarek, Walery. (1978a). Język literacki. W: Stanisław Urbańczyk (red.). *Encyklopedia wiedzy o języku polskim* (s. 137–138). Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk: Wydawnictwo Zakład Narodowy im. Ossolińskich.

Pisarek, Walery. (1978b). Język ogólny. W: Stanisław Urbańczyk (red.). *Encyklopedia wiedzy o języku polskim* (s. 138). Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk: Wydawnictwo Zakład Narodowy im. Ossolińskich.

Plotnìkaŭ, Branìslaŭ. (1994). Agul'nae movaznaŭstva. Mìnsk: Unìversìtèckae. [Плотнікаў, Браніслаў. (1994). *Агульнае мовазнаўства.* Мінск: Універсітэцкае].

Slivková, Ivana. (2021). *Spisovný jazyk ako aspekt kultúrnej identity: (slovensko-bieloruský kontext na základe prác S. Cambela a J. F. Karského)*. Prešov: Filozofická fakulta.

Šakun, Leŭ. (2001). *Karanì rodnaj movy.* Mìnsk: [b.v.]. [Шакун, Леў. (2001). *Карані роднай мовы.* Мінск: [б.в.].

Urbańczyk, Stanisław. (1978). Język polski. W: Stanisław Urbańczyk (red.). *Encyklopedia wiedzy o języku polskim* (s. 138–140). Wrocław–Warszawa–Kraków–Gdańsk: Wydawnictwo Zakład Narodowy im. Ossolińskich.

Wilkoń, Aleksander. (2000). *Typologia odmian językowych współczesnej polszczyzny*. Katowice: Wydawnictwo Uniwersytetu Śląskiego.

Zaprudskì, Sârgej. (2015).Moŭnae rèdagavanne ŭ Belarusì ŭ 1920-â gg. âk sacyâl'naâ praktyka ì lìngvìstyčnaâ rèfleksìâ. *Vesnìk BDU. Ser. 4*, 3, s. 29–35. [Запрудскі, Сяргей. (2015). Моўнае рэдагаванне ў Беларусі ў 1920-я гг. як сацыяльная практыка і лінгвістычная рэфлексія. *Веснік БДУ. Сер. 4*, 3, с. 29–35].

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:12



Zaprudskì, Sârgej ì ìnš.(2000). *Stratègìâ razvìccâ belaruskaj movy ŭ XXI stagoddzì*. [Запрудскі, Сяргей і інш. (2000). *Стратэгія развіцця беларускай мовы ў XXI стагоддзі*]. Pobrano z: https://knihi.com/Siarhiej_Zaprudski/Stratehija_razviccia_bielaruskaj_movy_u_XXI_stahoddzi_Prajekt.html (dostęp: 01.05.2022).

Zdunkiewicz-Jedynak, Dorota. (2010). Wykłady ze stylistyki. Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN.

SSLT – Alois Jedlička (red.). (1977). *Slovník slovanské lingvistické terminologie.* Zv. 1. Praha: Academia.

SUBMITTED: 6.07.2020
ACCEPTED: 11.10.2022
PUBLISHED ONLINE: 22.12.2022

## ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

**Viktoria Liashuk / Вікторыя Ляшук / Виктория Ляшук / Viktória Ľašuková** – Słowacja, Banská Bystrica, Uniwersytet Maciej Bela, Wydział Filozofii, Katedra Języków Słowiańskich; dr, doc.; spec.: językoznawstwo słowiańskie; zainteresowania naukowe: stylistyka, teoria słowiańskich języków literackich, glottodydaktyka (język białoruski jako rodzimy, język białoruski jako obcy), tłumaczenie z języków genetycznie bliskich.

Adres: Katedra slovanských jazykov, Filozofická fakulta, Univerzita Mateja Bela v Banskej Bystrici, ul. Tajovského 51, 97401 Banská Bystrica, Slovakia

Wybrane publikacje:

1. Ляшук, Вікторыя. (1997). *І прарастаюць словы. Дапаможнік для педагогаў дзіцячых дашкольных устаноў*. Мінск: Навукова-метадычны цэнтр.
2. Ľašuková [Ляшук], Viktoria. (2009). *Folklórny vektor v kodifikácii bieloruského a slovenského jazyka.* [Фальклорны вектар у кадыфікацыі беларускай і славацкай моў]. Prešov: Filozofická fakulta Prešovskej univerzity.
3. Ляшук, Вікторыя. (2012). *Развіццё лексічных сродкаў беларускай паэзіі.* Мінск: Беларускі інстытут сістэмнага аналізу і інфармацыйнага забеспячэння навукова-тэхнічнай сферы.
4. Ляшук, Виктория. (2017). *Теория славянских литературных языков в диахронии и синхронии. Научная монография*]. Banská Bystrica: Belianum.
5. Ляшук, Виктория. (2019). *Фольклорное койне в концептуализации славянских литературных языков.* Минск: Беларуская навука.